мы считаем, что наиболее эффективными, с точки зрения капитальных вложений, являются экологоориентированные и наукоемкие технологии. На сегодняшний день в развитых странах уровень строения органического капитала в аграрном секторе выше, чем в промышленности. Для того чтобы быть конкурентоспособным на мировом рынке, нашим производителям сельскохозяйственной продукции нужны огромные инвестиции, учитывая состояние отрасли в настоящее время. Поэтому развитие аграрного сектора целесообразно ограничить удовлетворением внутренних потребностей. В то же время инвестиционная политика должна быть направлена на развитие высокорентабельных производств, какими с учетом целей экологически устойчивого развития являются лесное хозяйство, а также малоотходные и наукоемкие технологии.

## ЛИТЕРАТУРА

1. Гофман К.Г. Экономическая оценка природных ресурсов в условиях социалистической экономики. – М.: Наука, 1977. – 287 с.
2. Нормативы капитальных вложений: Справочное пособие. – М.: Экономика, 1990. – 318 с.
3. Основы природопользования. – Мн.: Наука и техника, 1980. – 572 с.
4. Статистический ежегодник Республики Беларусь. – Мн., 2000. – 584 с.
5. Уиллиамс М.Р.В. Рациональное использование лесных ресурсов. – М.: Экология, 1991. – 128 с.
6. Федоренко Н.П. Экономические проблемы оптимизации природопользования. – М.: Наука, 1973. – С.8–21.
7. Хачатуров Т.С., Фейтельман Н.Г. и др. Инвестиционная политика природопользования. – М.: Наука, 1989. – 280 с.
8. Шимова О.С. Эколого-экономическое регулирование. – Мн.: ЗАО «Белбизнеспресс», 1998. – 286 с.

УДК 630*6

У.У. Цыбулька, аспірант; А.В. Зубкевіч, аспірант

# СТАНАЎЛЕННЕ РЫНКАВЫХ АДНОСІНАЎ У ЛЯСНЫМ КОМПЛЕКСЕ БЕЛАРУСІ (СУПЯРЭЧНАСЦІ, ПРАБЛЕМЫ, ПЕРСПЕКТЫВЫ)

The process of formation of the market relation in forest complex are analyzed in this article, the problems of cooperation between forestry and forest production are considered and necessary condition for it decision are proposed.

З усіх рэспублік былога СССР менавіта ў Беларусі найбольш выразна выявіліся вынікі адыходу ў лясной гаспадарцы ад прынцыпаў пастаянства і раўнамернасці лесакарыстання, асобнага функцыянавання лесагаспадарчай і лесапрамысловай вытворчасцей, каштарысна-бюджэтнай формы фінансавання лесагаспадарчай вытворчасці, цэнтралізаванага планавання і адміністрацыйных метадаў кіравання. Нягледзячы на бясспрэчныя дасягненні беларускіх лесаводаў, лясная гаспадарка да гэтага часу пакутуе ад наступстваў неразважлівага гаспадарання ў тыя часы: узроставая і відавая структура лясоў не адпавядае патрабаванням прынцыпу пастаянства іх развіцця, да гэтага часу не ўпарадкаваны лясы калгасаў, выдаткі на лясную гаспадарку пакрываюцца ўласнымі даходамі ў межах 50–60 % і г. д.

Пачынаючы з чэрвеня 1990 г. Беларусь як незалежная дзяржава пачала самастойна вызначаць сваю эканамічную палітыку ў лясной гаспадарцы.

Разам з трансфармацыяй гаспадарчай сістэмы ў Беларусі адбываецца адначасовая змена арыентацыі ў лясной гаспадарцы ў напрамку так званай шматфункцыянальнай лясной гаспадаркі. Адным з галоўных заданняў лесаводаў з'яўляецца дапамога лясной экасістэме ў пераадольванні негатыўных уплываў развіцця цывілізацыі. Гэты новы крытэрый эфектыўнасці гаспадарання – захаванне навакольнага асяроддзя – з'яўляецца і шанцам для вытворцаў вырабаў з драўніны – натуральнага матэрыялу, які не абцяжарвае асяроддзе. Палітыка, скіраваная на рэалізацыю такіх мэтаў, павінна ўлічваць інтарэсы партнёраў, якія могуць быць зацікаўлены ў поспехах такіх намаганняў. Да такіх партнёраў належыць лясная прамысловасць, ад эфектыўнасці якой залежаць даходы лясной гаспадаркі (асабліва пры ўмове самафінансавання апошняй).

Пераход ад каманднa-адміністрацыйнай сістэмы да рынкавай гаспадаркі спарадзіў канфлікт інтарэсаў. Знікае штучная сістэма рэгулявання – размеркаванне, пачаўся працэс стварэння новых самарэгуляцыйных механізмаў рынкавага характару. Такая змена заўжды вядзе да ўзросту важкасці кароткатэрміновых інтарэсаў, якія патрабуюць высокай дынамікі арганізацыйных ды функцыянальных пераўтварэнняў. Дадатковым аспектам, які ўскладняе сітуацыю ў лясным комплексе, з'яўляецца „вымушаная інтэграцыя" лясгасаў з лесанарыхтоўшчыкамі. Чамусьці ў Беларусі лічыцца, што нарыхтоўшчык значна ў большай ступені зацікаўлены ў захаванні лясной экасістэмы, чым лесавод, якому „ні ў якім разе нельга даваць у рукі сякеру, бо ўсё высячэ ды прадась". Эфектам гэткіх адносінаў з'яўляюцца патрабаванне карысці ад партнёра (у нашым выпадку ад пастаўшчыка), у выпадку чаго лясная гаспадарка змушана пастаўляць танную сыравіну, або з'яўленне прывілеяваных дагавораў, якія ствараюць няроўны (у параўнанні з іншымі партнёрамі ў галіне) доступ да рэсурсаў. Вышэйназваныя з'явы прывялі да негатыўных працэсаў, такіх, як незацікаўленасць лясгасаў у выніках сваёй працы, узвышэнне лесанарыхтоўшчыка над лесавырошчвальнікам, залішняе драбленне першапачатковай апрацоўкі драўніны, эксплуатацыйны характар высечак догляду і інш. Сусветная і айчынная практыка апошніх гадоў паказала, што найбольш эфектыўным аказваецца комплекснае вядзенне гаспадаркі, якое разумна спалучае лесавырошчванне і лесаэксплуатацыю. Іх поспех аказваецца найбольшым, калі яны не супрацьпастаўляюцца адзін аднаму, а пабудаваныя на ўзаемным выкананні сумесна абгрунтаваных патрабаванняў.

Аднак трансфармацыя лясной гаспадаркі ў бок рынкавых адносінаў зацягнулася. Вырашэнне шматлікіх пытанняў патрабуе развіцця і ўдасканалення навуковых асноў арганізацыі лясной гаспадаркі, распрацоўкі больш дасканалай структуры кіравання, развіцця прававых асноў лясной гаспадаркі. Нельга не адзначыць, што на працягу апошніх год у рэспубліцы быў прыняты шэраг важкіх рашэнняў, скіраваных на развіццё і ўдасканаленне лясной гаспадаркі: „Канцэпцыя ўстойлівага развіцця лясной гаспадаркі да 2015г.", „Рэкамендацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па пытанню развіцця лясной гаспадаркі і лесакарыстання", „Канцэпцыя развіцця лясной гаспадаркі", „Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб выманні ў сельскагаспадарчых і іншых землекарыстальнікаў лясных земляў і перадачы іх лесагаспадарчым прадпрыемствам Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь", „Лясны кодэкс РБ", „Стратэгічны план развіцця лясной гаспадаркі РБ". Ва ўсіх гэтых дакументах функцыі дзяржаўнага кіравання лясной гаспадаркай былі замацаваныя за Міністэрствам лясной гаспадаркі. Актыўна шукаліся найбольш эфектыўныя формы вядзення лясной гаспадаркі падчас рынкавых пераўтварэнняў у эканоміцы: увядзенне аўкцыённага продажу лесу на корані, пашырэнне сферы

прымянення дагаварных цэнаў, правядзенне эксперыменту ў Брэсцкім ВЛГА па ўдасканаленні сістэмы фінансавання лесагаспадарчай вытворчасці. Аднак да гэтага часу адсутнічаюць заканадаўчыя падставы ўвядзення ў жыццё распрацаваных на сённяшні момант праграм і канцэпцый рэфармавання лясной гаспадаркі. Акрамя таго, пераўтварэнне МЛГ у Камітэт па лясной гаспадарцы знізіла магчымасці галіны ў сферы рэструктурызацыі і рэфармавання. У Лясным кодэксе было ўведзена абмежаванне праў лясгасаў па вядзенні высечак галоўнага карыстання (толькі з дазволу Камітэта). Прадпрыемствы лясной гаспадаркі былі пераўтвораны ва ўстановы. Захавалася неэфектыўная каштарысна-бюджэтная форма фінансавання лесагаспадарчай вытворчасці, якая пярэчыць патрабаванням рынкавай эканомікі. Праўда, прыняты ў апошнім часе курс на лібералізацыю эканамічных адносінаў у нашай краіне дае шанцы на змены, аднак зноў жа замест комплекснага вырашэння пытання пераважае тэндэнцыя кансервавання старой сістэмы пры дапамозе дробных касметычных удасканаленняў.

На думку аўтараў, без прызнання інтарэсаў лясной гаспадаркі як адзінага цэлага, без прызнання яе не як пастаўшчыка таннай сыравіны, а як раўнапраўнага партнёра для лясной прамысловасці, немагчыма весці гаворку пра далейшае рэфармаванне ляснога комплексу. Да таго часу, пакуль асноўныя арганізацыйныя адзінкі лясной гаспадаркі – лясгасы – не будуць надзелены самастойнасцю, а таксама правам весці нарыхтоўку драўніны па галоўнаму карыстанню, застанецца разарванасць асноўнага лесаўзнаўленчага цыкла: „пасадка лесу – догляд за лесам – высечка лесу”. А гэта азначае адсутнасць гаспадара ў лесе.

Неабходнай умовай павышэння эфектыўнасці гаспадарання лясгасаў з’яўляецца рацыяналізацыя выдаткаў. Дасягненне неабходнага ўзроўню рэнтабельнасці лясной гаспадаркі і лясной прамысловасці залежыць не толькі ад рацыянальнасці і эфектыўнасці гаспадарання, але ж і ад сістэмы ды інстытутаў, якія ствараюць умовы супрацоўніцтва. Для арганізацыі нармальнага супрацоўніцтва між лясной гаспадаркай ды прамысловасцю неабходна стварэнне сістэмы камунікацыі, а таксама інстытутаў продажу круглых лесаматэрыялаў, удзелу ў рынку капіталу, рэкламы вырабаў з драўніны і г. д. Лясная гаспадарка і прамысловасць супрацоўнічаюць між сабой, заспакойваючы грамадскія патрэбы, у сістэме экалогія–лес–прадукт–чалавек. Каб гэтае супрацоўніцтва было плённым, неабходна стварыць нармальныя адносіны паміж лясной гаспадаркай і прамысловасцю. Яны павінны змяніцца: ад узаемнага „патрабавання дабротаў” (лясная гаспадарка – даходы ад продажу сыравіны, лясная прамысловасць – кошты набыцця сыравіны) да сумеснага „стварэння дабротаў”.

УДК 630*6

А.В. Зубкевіч, аспірант

## ВОПЫТ АРГАНІЗАЦЫІ ЛЕСАНАРЫХТОВАК У ЗАМЕЖНЫХ КРАІНАХ І МАГЧЫМАСЦІ ЯГО ПРЫМЯНЕННЯ ВА ЎМОВАХ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

The analysis of logging organization experience in foreign countries, pricing of round timber and stamp are considered in this article, the possibilities of its utilization in terms of Belarus are examined.

Лесанарыхтоўчая вытворчасць Беларусі прадстаўлена шматлікімі арганізацыйнымі формамі, рознымі формамі ўласнасці і параўноўча добра развіта, але